**Конкурсная праграма для вучняў старшых класаў у рамках літаратурнай гасцёўні, прысвечанай Адаму Міцкевічу**

**Бібліятэкар. А** цяпер пачынаем нашу  конкурсную праграму.

**Конкурс 1. Крыжаванка “Міцкевіч належыць усяму свету”**

1. Імя дзяўчыны, якую пакахаў А.Міцкевіч, калі быў юнаком.
2. Паэма, якую А.Міцкевіч напісаў пасля амаль адначасова страты маці і свайго кахання.
3. Паэтычная аповесць А.Міцкевіча, дзе выдатна адлюстравана гістарычнае мінулае Беларусі.
4. А.Міцкевіч жыў у … асяроддзі, дзе паўсядзённа-бытавая гутарковая мова мела шмат беларускіх элементаў.
5. Апынуўшыся ў выгнанні, А.Міцкевіч адбываў яго ў Маскве, Пецярбургу, Адэсе і … .
6. Як называлі паэтаў-вальдумцаў, да якіх належаў і А.Міцкевіч?
7. У часы знаходжання ў Маскве і … А.Міцкевіч пазнаёміўся і на ўсё жыццё пасябраваў з вядомымі дзеячамі рускай літаратуры В.Жукоўскім, А.Пушкіным, І.Крыловым, А Грыбаедавым.
8. Кім працаваў бацька А.Міцкевіча?
9. Паэтычную інтэрпрэтацыю … беларусаў зрабіў А.Міцкевіч у сваім творы “Дзяды”.
10. У эміграцыі ў Парыжы А.Міцкевіч напісаў свой галоўны твор “Пан …”.
11. Імя польскай пісьменніцы (прозвішча — Варненская), якая напісала кнігу пра Адама Міцкевіча “Край гадоў дзяцінных”.
12. Прозвішча сябра А.Міцкевіча, які яму даваў заўвагі і парады па напісанне твораў?

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | А | | | | | |
| | | | | 2 Д | | | | | |
| | | 3 | | А | | | | | |
| 4 | | | | М | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5 | | | М | | | | | | | | |
| | | | 6 | І | | | | | | | | |
| | | 7 | | Ц | | | | | | | | |
| 8 | | | | К | | | | | | | | |
| | | | 9 | Е | | | | | | | | |
| 10 | | | | В | | | | | | | | |
| | 11 | | | І | | | | | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Ч | | | | |

Для праверкі журы

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | М | А | р | ы | л | я | |
| | | | | Д | з | я | д | ы | |
| | | Г | р | А | ж | ы | н | а | |
| д | в | у | х | М | о | ў | н | ы | м |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | К | р | ы | М | е | | | | | | | |
| | | | ф | І | л | а | М | А | т | Ы | | |
| | | П | е | Ц | я | р | б | у | р | г | у | |
| А | д | в | а | К | а | т | а | М | | | | |
| | | | в | Е | р | а | в | а | н | н | я | ў |
| Т | а | д | э | В | У | ш | | | | | | |
| | М | о | н | І | К | а | | | | | | |
| | | | | Ч | А | ч | о | Т | | | | |

Адказы
1. Марыля. 2. Дзяды. 3. Гражына. 4. Двухмоўным. 5. Крыме. 6. Філаматы. 7. Пецярбургу. 8. Адвакатам. 9. Вераванняў. 10. Тадэвуш. 11. Моніка. 12. Чачот.

**Конкурс 2. “Адгадай героя”**

1. Гэтую гераіню людзі ўспрымалі як вар’ятку, яна быццам бачыла свайго памерлага каханага і размаўляла з ім. Шчырае і глыбокае пачуццё зрабіла яе душу відушчай. Натоўп навокал дапускае, што такое можа быць. Адзін толькі стары, у якога ёсць павелічальнае шкло, упарта сцвярджае, што ён нічога не бачыць і што дзяўчына нясе глупства, “а чэрнь неразумная верыць”. (Каруся.)
2. Яна была княгіняй, але дзеля важнай справы слугі маглі разбудзіць яе нават ноччу. Яна была стройнай, зграбнай і лічылася першай прыгажуняй на Наднямонні. Яна не сядзела з вязаннем і вышываннем, а, перапрануўшыся ў мужчынскае адзенне, ехала на баявым кані на паляванне, і яе нават часта блыталі з яе мужам — князем, якому яна была не толькі жонкай, але і саветнікам.
(Гражына.)
3. Гэты князь быў з маладосці ўпарты і скрытны, ніколі не адмаўляўся ад свайго рашэння.
(Літавор.)

**Конкурс 3. “Адгадай твор Адама Міцкевіча па яго апісанні”**

1. Хлопец з дзяўчынай любяць гуляць каля берага возера, частуюцца салодкімі малінамі, якіх дзяўчына назбірала поўны кош. Такі ідылічны пачатак балады як быццам не прадракае трагічных падзей. Хлопец прысягае

дзяўчыне на вернасць, але яна нечакана знікае, каб з'явіцца перад каханым у іншай постаці, каб выпрабаваць яго пачуццё. Хлопец спалохаўся, парушае клятву — і таму павінен быць пакараны за амаральны ўчынак. "Русалка" губіць стральца за ашуканства, за здраджанае каханне. Здрада, адступніства павінны быць пакараны — такую агульчалавечую думку праводзіць паэт праз увесь твор.
("Свіцязянка".)
2. Балада аб немінучым пакаранні таго, хто сее няшчасці, крыўдзіць безабаронных і даверлівых. У гэтай баладзе крыўдзіцелем выступае пан. Падманутая ім дзяўчына кінулася ў хвалі і толькі тады выплывала з вады рыбкай, калі да берага прыходзіў верны слуга з дзіцём на руках і клікаў яе пакарміць немаўля. Але аднойчы слуга не змог зрабіць гэтага, бо якраз каля рэчкі пан гуляў са сваёй жонкай.
("Рыбка".)
3. Па дзяўчыну з таго свету вяртаецца яго каханы, і яна без ваганняў, даверліва і аддана кіруецца з ім у апошні шлях. Дзяўчына пераступае мяжу жыцця, каб не пераступіць мяжу вернасці.
("Уцёкі".)
4. У гэтай баладзе паказаны характар і стыль беларускіх народных пахавальных плачаў. Маці плача і нібы гаворыць са сваёй памерлай дачкой.
("Курганок Марылі".)
5. Нязбытная туга па радзіме змусіла Адама Міцкевіча ў 1832 годзе напісаць велічную эпапею. Пераважная большасць герояў гэтай паэмы — тутэйшыя людзі, не перасяленцы, а мясцовыя, не польская, а беларуская шляхта. Героі пачуваюць сябе, як і сам паэт, і ліцвінамі, і палякамі адначасова. У гэтым творы паэт намерыўся ўзнавіць усё сваё жыццё на Навагрудчыне. Асноўная сюжэтная лінія твора — маёмасныя спрэчкі двух шляхецкіх родаў. Падзеі разгортваюцца ў Туганавічах, дзе Марыля Верашчака адмовіла паэту быць яго жонкай.
("Пан Тадэвуш".)
6. Паэма, у аснову якой Адам Міцкевіч паклаў старажытны памінальны абрад беларусаў. Кіруе абрадам Дзядоў Гусляр, які ў паэме тры разы ператвараецца то Ксёндзам, то Зданню, то Чараўніком.
("Дзяды".)
7. У гэтай паэме згадваюцца літоўскія князі Гедымін, Вітаўт, Ягайла. У тлумачэнні паэта прыводзяцца імёны старажытных і сучасных гісторыкаў. Князь Літавор збіраўся выступіць з войскам на горад Ліду, каб забраць прыданае сваёй жонкі. Вітаўт паабяцаў назначыць Літавора князем Ліды, але свае абяцанні не выканаў, таму Літавор захацеў забраць сілай тое, што яму належыць па праве. Саветнік Рымвід хацеў адгаварыць князя, каб захаваць мір, але пазней зразумеў, што князь ад яго нешта хавае.
("Гражына".)

**Конкурс 4. "Па ўрыўку адгадай твор Адама Міцкевіча"**

1. *Граф зразумець не мог — адкуль жа з непрывычкі*
*Яму, заезжаму з Еўропы, ведаць звычкі*
*Глухой правінцыі? І ён імклівай рыссю*
*Пусціўся з дзіва ў гай — аж узлятала крыссе.*
*А там грыбоў — уброд. Як жоўтага гароху*
*Хтось сыпануў у мох зязюльчын, і з-пад моху*
*Выглядваюць лісічкі — што і трэба паням,*
*Бо ў гэтым грыбе мошак і чарвы — нізвання.*
("Пан Тадэвуш".)

2. *Едзе шумнае вяселле.*
*"Маці, лепш не да алтара,*
*А вязіце да цвінтара,*
*Будзе мне труна пасцеллю.*
*Калі мёртвы ён — памру я,*
*Жаль заб'е цябе, старую".*
("Свіцязянка".)

3. *Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,*
*Жывіцы настоем смалістым.*
*Там возера Свіцязь, як шыбіна люду,*
*Ляжыць паміж дрэваў цяністых.*
("Свіцязь".)

4. *Любімыя заняткі маладзіцы*
*Не раз адкладвала і зброю брала.*
*Не раз на жмудскім скакуне гарачым*
*Ў рысінай шапцы, у мядзведжай свіце*
*Паміж стралкамі, як сапраўдны віцязь,*
*Бывала, полем ці дарогай скача.*
("Гражына".)

5. *Мой Нёман, родная рака, дзе хвалі тыя,*
*А з імі столькі шчасця, і надзей і мараў?*
*Дзе весялосць, маленства мілае без хмараў?*
*Дзе век бурлівы, леты нашы маладыя?*
*Лаура дзе? Сяброў не бачу, любых твараў,*
*Усё прайшло, а слёзы памяці жывыя.*
("Да Нёмна".)

**Конкурс 5. "Па алфавіце пералічыце вядомыя вам творы Адама Міцкевіча"**

1. "Алушта днём".
2. "Бура".

3. “Гражына”.
4. “Да Нёмна”.
5. “Дзяды”.
6. “Курганок Марылі”.
7. “Магілы гарэма”.
8. “Ода да маладосці”.
9. “Пралеска”.
10. “Пан Тадэвуш”.
11. “Рамантычнасць”.
12. “Рыбка”.
13. “Свіцязянка”.
14. “Уцёкі”.

**Тэрэза КАВАЛЬЧУК, загадчыца бібліятэкі гімназіі № 2 Ваўкавыска.**